асноўнага аб'ёму («дах ламаны») і прымыкаў да франтона ўсходняга фасада (магчыма і сцены прэсбітэрыя былі крыху ніжэй, чым сцены асноўнага аб'ёму).

Сакрысція мела аднасхільны дах, які прымыкаў да паўночнай сцяны прэсбітэрыя.

У асноўным аб'ёме было чатыры вокны (па два на кожным бакавым фасадзе), якія, відаць, мелі форму стральчатых ці больш архаічных паўцыркульных арак. У апсідзе, над галоўным алтаром, было яшчэ адно авальнае акно (магчыма больш позняга паходжання) і адно акно з жалезнымі кратамі ў сакрысціі.

Паводле Інвентара 1907 г., заходні фасад набыў цяперашняе аблічча ў ходзе перабудовы 1897 г.

Так, касцёл ва Уселюбе можна вызначыць як аднанефны гатычны храм. Такі прасторавы тып храма, паводле сцвярджэння вядомай даследчыцы гатычнай архітэктуры Літвы А. С. Янкявічэне, ужо ў XIII—XIV ст. быў шырока распаўсюджаны ў Прусіі, Мазовіі і Лівоніі, прычым характэрны ён менавіта для правінцыяльных храмаў [9]. Звычайна гэта былі невялікія пабудовы (паводле Інвентара 1830 г., гэты касцёл меў такія памеры: «37¼ локця×18 локцяў; вышыня — 15 локцяў», гэта значыць 24,2××11,7 м пры вышыні ў 9,7 м). Гэтыя памеры амаль супадаюць з памерам (паводле Янкявічэне) касцёла Мікалая ў Каўнасе (XV ст.). Адсутнасць скляпенняў таксама даволі характэрная для храмаў гэтага тыпу, асабліва для помнікаў Мазовіі [10].

Бліжэйшым аналагам гэтага помніка можа служыць касцёл пачатку XV ст. у Кейдайняй (св. Георгія). Як сведчыць А. С. Янкявічэне, яго ўнутраная прастора, амаль 15-метровай шырыні, была першапачаткова перакрыта плоскай драўлянай столлю і толькі ў XVIII—XIX ст. былі ўзведзены скляпенні [11].

**Р. БАРАВЫ.**

---

[1] Найбольш значнай і вядомай працай з'яўляецца даведнік І. Жмігродскага — Zmigrodzki J. Nowogródek i okolice. Nowogródek. 1927.

[2] Boniecki A. Poczet rodow w W. Ks. Lit. w XV i XVI ww. Warszawa. 1883. C. 205.

[3] Wolff J. Senatorowie i dygnitarze W. Ks. Lit. Krakow. 1885. C. 44.

[4] Codex diplomatikus ecclesiae cathedris necnon dioceseos Vilnensis. I. Krakow. 1948. N 197.

[5] Там жа, № 361.

[6] Semkowicz Wl. O litewskich rodach bojarskich...— Mies. Herald. 1914. N 5—6. C. 96—103.

[7] Abramayskas S. Plytu dydziai XIV—XV amziu Lietuvos architekturos paminkluose.— Valstybines LTSR architekturos paminkl, apsaugos inspekcijos metrastis. I. Vilnius. 1958. C. 36.

[8] ЦДГА БССР, ф. 1781, воп. 27, ад. зах. 489, 494 і інш.

[9] Гриневичюте-Янкявичене А. Основные черты пространства н формы однонефных и зальных готических зданий Литвы. // Научные труды высших учебных заведений Лит. ССР. Строительство и архитектура. 1. 1961. С. 238.

[10] Там жа. С. 239.

[11] Там жа. С. 240—242.

# ДАСАЕДЧЫК ЭПОХІ ФЕАДАЛІЗМУ

Фёдар Іванавіч Забела— беларускі савецкі гісторык, аўтар цікавых навуковых прац па гісторыі Беларусі эпохі феадалізму, адзін з першых прадстаўнікоў нацыянальных кадраў рэспублікі ў галіне гісторыі. Многае яшчэ невядома аб жыцці і дзейнасці таленавітага вучонага. Тым большую каштоўнасць набываюць матэрыялы аб ім, знойдзеныя ў архіве Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва, аналіз навуковай спадчыны Ф. І. Забелы, спроба паказаць

**Купалле.** Фота **Я. Контыша.**





У. І. Пічэта (другі злева) з аспірантамі. Ф. І. Забела—крайні справа. 1926 г.

уклад даследчыка ў беларускую савецкую навуку.

Фёдар Іванавіч Забела нарадзіўся ў сакавіку 1896 г. у пасёлку Чабусы Асавецкай воласці Бабруйскага павета ў сям'і мешчаніна. У 1916 ён скончыў гімназію. З 1921 г. працаваў настаўнікам у Мінску. Адначасова ён вучыўся на сацыяльна-гістарычным аддзяленні педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Яшчэ студэнтам Ф. І. Забела працаваў бібліятэкарам навуковага кабінета беларускай гісторыі БДУ. Ужо тады праявіліся здольнасці Фёдара Забелы да навуковай працы па гісторыі Беларусі эпохі феадалізму. Ён быў адным з самых актыўных членаў студэнцкага навуковага таварыства універсітэта і з самага лепшага боку зарэкамендаваў сябе ў семінары па гісторыі Беларусі, якім кіраваў выдатны савецкі гісторык, адзін з заснавальнікаў беларускай савецкай гістарычнай навукі, прафесар У. І. Пічэта.

Пасля заканчэння педагагічнага факультэта Наркамасветы БССР пакінуў яго ва універсітэце для навуковай працы. У асабовай справе Ф. І. Забелы захоўваецца такі дакумент: «Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту. Галоўпрафасветы на падставе водзываў працаўнікоў універсітэта вырашана скончыўшых педфак БДУ тт. Бурдзейка А. і Забелу Ф. адкамандзіраваць у распараджэнне Універсітэта для навуковай працы. Тт. Бурдзейка і Забела ўзяты на ўтрыманне Наркамасветы. Просьба к праўленню Універсітэта распрацаваць план навуковай працы для іх і тэрмін яе сканчэння.

Па думцы Галоўпрафасветы, тт. Бурдзейка і Забела павінны быць выключна на навуковай працы і іх не варта загружаць якой бы то ні было навучальнай працай па Універсітэту. Галоўная мэта—падрыхтоўка працаўніка большай кваліфікацыі ў мінімум часу.

Нам. Наркамасветы
і Старшыня Галоўпрафасветы
17.XII. 1925 г.»[1]

Ф. І. Забела бліскуча абараніў дыпломную работу на тэму «Дворная гаспадарка на Беларусі ў другой палове XVIII ст. і быт падданага сялянства». Гэту праблему ён даследаваў і пазней.

Гісторыя сялянства і сельскай гаспадаркі Беларусі ў другой палове XVIII ст. стала адной з цэнтральных тэм у навуковай дзейнасці Забелы. У 1928 г. выходзіць яго артыкул «Панская гаспадарка на Беларусі і быт падданага сялянства ў другой палове XVIII стагоддзя». У гэтай працы вучоны сістэматызаваў матэрыялы каля 100 інвентароў маёнткаў, апублікаваных у Актах Віленскай археаграфічнай камісіі. Ён першы з беларускіх гісторыкаў падрабязна даследаваў феа-

Роздум ля помніка.



дальнае памесце і становішча прыгоннага сялянства.

На падставе глыбокага аналізу шматлікіх інвентароў маёнткаў, складзеных у 1750—1800 гг., Ф. І. Забела прыходзіць да вываду аб узмацненні эксплуатацыі сялянства ў другой палове XVIII ст. у параўнанні з яго першай паловай. Ён робіць вывад аб «імкненні двара ў другой палове XVIII ст. пераводзіць не толькі даніны прадуктамі, але нават усе павіннасці цяглых адносна двара на грошы». Такім чынам, ён паказвае развіццё таварна-грашовых адносін у феадальным памесці.

Даследчык спрабуе аналізаваць велічыню павіннасцей цяглых сялян у розных мясцовасцях Беларусі ў другой палове XVIII ст. Ён адзначае, што самай жорсткай эксплуатацыі падвяргаюцца сяляне Мсціслаўшчыны, дзе лік паншчынных дзён даходзіць да 24 з паловы валокі. Затым ідзе Віцебшчына, Ашмяншчына, Полаччына.

Адным з першых у беларускай савецкай гістарыяграфіі канстатаваўшы ўзмацненне прыгонніцтва і развіццё феадальнага памесця на Беларусі ў другой палове XVIII ст., Ф. І. Забела, аднак, пад уплывам М. В. Доўнар-Запольскага паўтарыў яго памылковую думку аб заняпадзе эканомікі Беларусі ў той час, падкрэсліваў натуральны характар сялянскай гаспадаркі, адмаўляючы яе сувязь з рынкам [2]. Часткова гэта можна тлумачыць тым, што ў яго распараджэнні было вельмі мала крыніц.

Пад кіраўніцтвам прафесара У. І. Пічэты Фёдар Іванавіч стварыў каштоўнае даследаванне «Землеўласнік і земляроб па Статуту літоўскаму 1588 г.». Даследчык робіць вывад, што поўнае права эксплуатацыі зямлі мае толькі яе ўласнік і ніхто іншы. Ён падкрэслівае: «...трэба лічыць, што адзінай сацыяльнай групай у дзяржаве, якая мела поўнае права ўладання зямлёй на аснове ўласнасці, была шляхта». У той жа час вучоны адзначае, што «групы земляробаў, якія сядзелі на панскай зямлі, мелі права толькі яе карыстання, а не на распараджэнне апошняю. Нават не ўсе спосабы карыстання былі для іх дазволены». На думку Фёдара Іванавіча, Статут 1588 г., ідучы насустрач пану-землеўласніку, замацаваў за ім усе тыя правы ў адносінах да земляробаў, якія былі набыты фактычна землеўласнікам к канцу XVI ст.

Шмат цікавых думак і назіранняў у матэрыяле Ф. І. Забелы «Месца Берасцейскае ў XVI стагоддзі» (сацыяльна-эканамічны нарыс), які быў надрукаваны ў 1929 г. І хоць па сутнасці ён з'яўляецца зводкай фактычнага матэрыялу аб гандлёвай і рамесніцкай дзейнасці гараджан без крытычнага аналізу выкарыстаных крыніц, важна, што аўтар звяртае ўвагу на значную ролю Брэста ў развіцці гандлю і гандлёвых сувязей з суседнімі краінамі ў XVI ст.

З анкеты, якую запоўніў Фёдар Іванавіч для работы ў маскоўскіх архівах у лютым 1928 г., мы даведваемся, што ён распрацоўваў пытанні тэмы «Лівонія ў другой палове XVI стагоддзя».

На жаль, вялікім навуковым задумам Забелы не суджана было збыцца. За выключэннем невялікай рэцэнзіі на кнігу А. К. Супінскага «Прыгонная Віцебшчына», апублікаванай даследчыкам у 1928 г., ні адна яго навуковая праца пасля 1930 года не выйшла ў свет.

У асобе Фёдара Іванавіча Забелы беларуская савецкая гістарычная навука, якая ў 20-я гады перажывала перыяд свайго станаўлення, страціла таленавітага даследчыка эпохі феадалізму. Яго імя назаўсёды застанецца ў гісторыі беларускай савецкай навукі і культуры.

**Э. ІОФЕ,**
**кандыдат гістарычных навук.**

---

[1] ЦДАКР БССР, ф. 205, воп. 3, адз. зах. 2917, а. 11.

[2] Забела Ф. І. Панская гаспадарка на Беларусі і быт падданага сялянства ў другой палове XVIII ст. Запіскі Аддзелу гуманітарных навук ІБК. Кн. 3. Працы класа гісторыі. Т. 11. Мінск, 1928. С. 142.

Будынак музея ў Раўбічах.
Фота А. Нікалаева.



Помнік Максіму Багдановічу ў Мінску.

